# КУЛАГІНА ВЕРА СЯМЁНАЎНА

**Месца нараджэння:** г. Слуцк, Мінская вобласць

**Дата нараджэння:** 18.02.1923

**Дата смерці:** 08.12.2008

**Ушанаванне:**
г. Віцебск, вул. Урыцкага, 12/23 – мемарыяльная дошка



Вера Сямёнаўна Кулагіна нарадзілася 18 лютага 1923 года ў г. Слуцку Мінскай вобласці. Перад вайной скончыла Віцебскі педагагічны тэхнікум.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны актыўна ўключылася ў барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З пачаткам акупацыі ў ліпені 1941 года ў в. Букаціна была арганізавана падпольная група пад кіраўніцтвам Веры Кулагінай. Падпольшчыкі падтрымлівалі сувязь з партызанскай групай І. Буцьянава. У Лужаснянскім лесе патрыёты збіралі зброю і дапамагалі салдатам і афіцэрам Чырвонай арміі, якія трапілі ў акружэнне.

Пасля таго, як у жніўні 1942 года акупанты спалілі вёску Букаціна, Вера з маці і сёстрамі Марыяй і Ганнай перабраліся ў в. Падбярэззе. Пасля ўсталявання цеснай сувязі з групамі І. Бекішава, М. Журынскай, В. Арлоўскага, Е. Сакаловай падпольшчыкі перадавалі партызанам звесткі аб перамяшчэнні нямецкіх войскаў, будаўніцтве ўмацаванняў, а таксама медыкаменты і перавязачныя матэрыялы. У Віцебск патрыёты дастаўлялі лістоўкі, газеты, узрыўчатку.

Смела дзейнічала Вера Кулагіна па мянушцы «Ліса». Яе ведалі па такой падпольнай мянушцы, таму што, выконваючы заданне, яна магла прайсці ў горад у любы час і ў любым месцы, умела знайсці выйсце з любой крытычнай сітуацыі. Ёй часта даводзілася сустракацца з нямецкімі салдатамі і паліцэйскімі. Яна непрыкметна выведывала ў іх патрэбныя партызанам звесткі.

Калі з’явілася пагроза разгрому групы, было прынята рашэнне ісці да партызан. З вясны 1943 г. В. Кулагіна стала сувязной Віцебскага падпольнага гаркама КП(Б)б. Вера Сямёнаўна непасрэдна ўдзельнічала ў баявых аперацыях партызан па разгроме фашысцкіх гарнізонаў, пяць разоў пераходзіла лінію фронту.

З лістапада 1943 да чэрвеня 1944 года Вера Кулагіна працавала ў складзе Віцебскай аператыўнай групы, якая знаходзілася ў в. Грабенікі Лёзненскага раёна.

Пасля вызвалення Вера Сямёнаўна прымала актыўны ўдзел у працы па аднаўленні разбуранага Віцебска. Была інспектарам гарадскога аддзела народнай адукацыі па дашкольным выхаванні. Працавала другім сакратаром Кастрычніцкага райкама, другім сакратаром Віцебскага гаркама камсамола. Пасля заканчэння ў 1950 годзе Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦК КПБ узначаліла лектарскую групу Віцебскага абкама камсамола, з’яўлялася сакратаром камітэта камсамола Віцебскага ветэрынарнага інстытута, інструктарам Віцебскага гаркама КПБ. У 1959 г. Вера Сямёнаўна была прызначана дырэктарам Дома тэхнікі. З 1967 па 1993 год працавала загадчыкам аддзела культуры, сакратаром, інспектарам выканкама Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Пасля выхаду на пенсію ў 1993 годзе В. С. Кулагіна працягвала грамадскую дзейнасць і да апошніх дзён заставалася ганаровым старшынёй Віцебскай гарадской арганізацыі грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз жанчын».

Вера Сямёнаўна Кулагіна была ўзнагароджана ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медалямі. За каласальную грамадскую работу, значны ўклад у развіццё горада 4 мая 1995 года В. С. Кулагінай прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Віцебска».

Памерла Вера Сямёнаўна 8 снежня 2008 года. 26 чэрвеня 2015 года на доме, дзе апошнія гады жыла В. С. Кулагіна (вул. Урыцкага, 12/23), урачыста адкрыта мемарыяльная дошка.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група В. С. Кулагінай / Н. І. Дарафеенка // Памяць : Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і нш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 488–489.

2. **Долготович, Б. Д.** Кулагина Вера Семеновна / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов : биогр. спр. / Б. Д. Долготович. – Минск, 2008. – С. 60.

3. **Газин, Д.** Неутомимая, та самая Верочка / Д. Газин // Віцьбічы=Витьбичи. – 1999. – 2 июля. – С. 7.

4. **Иванова, Г.** Одна из тех, кем гордится Витебск / Г. Иванова // Народнае слова. – 2010. – 20 лют. – С. 2.

5. **Крупица, Н.** Имя, которое объединяет / Н. Крупица // Віцьбічы=Витьбичи. – 2015. – 20 июня. – С. 1, 2.

6. **Кулагіна** Вера Сямёнаўна // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Віцебска : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн. – Мінск, 2003. – Кн. 2. – С. 521.

7. **Писаренко, Н.** Ее псевдоним был – Лиса / Н. Писаренко // Віцьбічы=Витьбичи. – 2004. – 26 июня. – С. 5.

8. **Писаренко, Н.** Рецепт ее счастья / Н. Писаренко // Віцьбічы=Витьбичи. – 2003. – 20 февр. – С. 2.

9. **Писаренко, Н.** Уроки жизни от Веры Семеновны / Н. Писаренко // Віцьбічы=Витьбичи. – 2008. – 16 февр. – С. 4.

10. **Писаренко, Н.** Эта знакомая и незнакомая Кулагина / Н. Писаренко // Віцьбічы=Витьбичи. – 2002. – 1 окт. – С. 3.

11. **Яковлев, Д.** Ее звали «Лисой» / Д. Яковлев // Віцьбічы=Витьбичи. – 2018. – 21 апр. – С. 11.